яго і праўду сказаць, дык і ня ведаю, да якое станцыі лепей браць білет. Ведаю толькі, што да Анапы ходзяць аўтобусы ад Наварасійску. Думаю, што гэта, можа, ведаюць лепш чыгуначнікі. Зрэшты, да якой апошняй станцыі не паедзеш, усё роўна важна, мабыць, каб даехаць перш за ўсё да ўзмор'я. З гэтага боку, можа, лепей ехаць перш да Наварасійску. А адтуль можна будзе ці аўтобусам, ці параходам. У Анапе–ж зразу ідзі да Н[ікалая] П[аўлавіча] і з прывітаньнем ад мяне.

Я тым часам атаўбоўваюся, ня ведаю, ці надоўга, у Кіраве. Сям'я пераехала ў апошніх лічбах жніўня. Жывём пакуль што ў невялічкім, усяго дзесяцімэтровым пакойчыку разам з Антосем. Цесната страшэнная. Антон дык нават перабраўся ўжо спаць на вышкі. Частку рэчаў пакінуў на кватэры ў Дунько, частку зьмясьціў на вышках. Ты–ж ведаеш, пэўна, што мая з Менску забрала ўсе рэчы, вось цяпер і цягаецца з імі з места на места. Кажу цягаецца, бо мне выехаць у Слабадзкі па сям'ю не дазволілі, і Аня мусіла адна перабірацца. Добра яшчэ, што гэта недалёка і што ўдалося ўсё перавезьці на аўтамашыне. Цяпер ужо, калі дажывём да вольнага часу, рэчы будзем ліквідоўваць і пераяжджаць будзем, так–бы сказаць, улегцы. Усё–ж добра, што пераехала сям'я. Паспакайнела і Аня, і дзеці. Змучыліся былі бяз бацькі. А яны–ж вельмі ўжо ўбіваюцца па мне. Як прышла тэлеграма з Анапы, я пісаў Ані, каб ехала туды, і калі дзеці пра гэта даведаліся, дык пры ўсім іхнім жаданьні ўбачыць мора і пажыць каля яго, наадрэз адмовіліся ехаць туды бяз „баціка“. Цяпер усе разам. Дзеці ходзяць у школу: Лора ў чацьвертую клясу, Ляля ў першую. Аня працуе ў дапаможнай школе пам[очнікам] дырэктара па вуч[эбнай] часьці і мае чатырнаццаць тыднёвых часін літаратуры і мовы ў гэтай–жа школе. От так у працы да ў клопаце аб кватэры і сходзіць час. М[аксім] Г[арэцкі] на Смаленшчыне ў Пясочным выкладчыкам у сярэдняй школе. Сям'я яшчэ не пераехала. Уладзік падаў заяву ў ЦВК, вынікаў яшчэ няма. Я не абскарджваў. Пішы, Язэп. Твае лісты скрашваюць шэрасьць выгнаньня. Прывітаньне ад Антося і ўсёй маёй сям'і і табе з сям'ёю. Цалую моцна.

Твой *Адам*.

## № 123. Ганьне Бабарэцы

*23/IV–1938 г.*

Отказываюсь. Прошу отправить обратно.
А. Бабарека.

## № 124. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*1.VI.1938*

Дорогие мои Анечка, Лёлечка и Лялечка!

Я здоров. Всё по–старому. Сейчас разрешены продуктовые передачи, посылки и письма. Посылку вещевую я получил 28 мая и, признаться, пожалел твоих, Аня, забот, потому что вещи эти мне не нужны, а табак я не курю вот уж 10–й месяц. Жаль, что ты не послала никаких продуктов. Как только получишь это письмо, принеси передачу прямо в передаточную тюрьмы срочно–заключенному. Передай побольше сухарей, сала, сахарного песку, сухих фруктов, масла, луку, чесноку. Остальное по своему усмотрению. Важно продуктов побольше не скоропортящихся, но содержа-